каря-библиографа существуют на стыке дисциплин. Синтез библиотековедения, библиографоведения и книговедения и смежных с ними экономических, правовых, педагогических и иных наук порождает качественно новый комплекс знаний, умений и опыта, позволяющих библиотекарю-библиографу обоснованно и более эффективно решать профессиональные задачи.


*1.* Высшее образование. Первая ступень. Цикл социально-гуманитарных дисциплин: образовательный стандарт : РД РБ 02100.5.227-2006. – Введ. 01.09.2006. – Минск : М-во образования Респ. Беларусь, 2006. IV. – 26 с.

*2.* Вышэйшая адукцыя. Першая ступень. Спецыяльнасць Е 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках). Кваліфікацыя – Бібліятэкар-бібліёграф : ОС РБ 1-23 01 11-2008. – Уведз. 12.06.2008. – Мінск : М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, 2008. –38 с.

*3. Зимняя, И. А.* Социально-профессиональная компетентность как целостный результат профессионального образования / И. А. Зимняя // Высшая школа: проблемы и перспективы : материалы 7 междунар. науч.-метод. конф., Минск, 1–2 нояб. 2005 г. / Респ. ин-т высш. шк. – Минск, 2005. – С. 283–286.

*4.* Педагогическое образование в Республике Беларусь: аналитические материалы : практ. пособие / П. Д. Кухарчик [и др.] ; Белорус. гос. пед. ун-т ; под общ. ред. И. И. Цыркуна. – Минск : БГПУ, 2007. – 235 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


**Л. І. Даніленка,** *старшы выкладчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў;*
**А. М. Пісарэнка,** *прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*


# ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНА-АСОБАСНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ БУДУЧАГА БІБЛІЯТЭКАРА

Сучасныя бібліятэкі, застаючыся інфармацыйнымі і інтэлектуальнымі цэнтрамі, усё больш увагі надаюць задавальненню культурных патрэбнасцяў карыстальнікаў, развіццю іх творчых

здольнасцяў, у тым ліку сродкамі мастацкай літаратуры і, у прыватнасці, паэзіі.

Наша мэта – выявіць ролю паэтычнай творчасці студэнтаў спецыяльнасці «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» у кантэксце сучасных тэндэнцый у дзейнасці бібліятэк з паэтычнымі творамі.

Аналіз публікацый у прафесійным друку на падставе базы даных «Библиотечное дело и библиография» Інфармкультуры РФ, публікацый у прафесійных часопісах Беларусі «Бібліятэчны свет» і «Бібліятэка прапануе», раздзела «Навіны» інтэрнэт-партала Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, сайтаў абласных бібліятэк Рэспублікі Беларусь дазваляе вылучыць у якасці асноўных наступныя моманты ў шматгранных суаносінах такіх з’яў і паняццяў, як «паэзія» і «бібліятэка», якія акрэсліваюць кірункі дзейнасці будучага спецыяліста ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці з паэтычнымі творамі, яго стаўленне да іх у прафесійным і асабістым плане.

Па-першае, бібліятэка як сацыяльны інстытут забяспечвае *фарміраванне фондаў паэтычных твораў*. У навуковых даследаваннях паэтычнага сегменту фондаў бібліятэк зараз увага скіравана на прыватныя калекцыі паэтаў у складзе фондаў нацыянальных бібліятэк, прыжыццёвыя выданні іх кніг, архіўныя матэрыялы, у т. л. фотаздымкі і ўспаміны пра паэтаў у аддзелах рукапісаў навуковых бібліятэк. Гісторыкамі бібліятэчнай справы разам з гісторыкамі літаратуры і музеязнаўцамі, даследуюцца лёсы бібліятэк асобных паэтаў (М. А. Някрасава, І. Севяраніна), кола іх чытання (А. С. Пушкін), адносіны да бібліятэк.

Па-другое, прафесійная бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць забяспечвае задавальненне *інтарэсу розных катэгорый карыстальнікаў бібліятэк да паэтычнага сегменту фонда*. Паэзія разглядаецца як сродак бібліятэрапіі, рэгуляцыі і карэкцыі псіхічных станаў асобы суб’екта паэтычнай творчасці пры чытанні або праслухоўванні паэтычных твораў [1].

Па-трэцяе, папулярызацыя паэзіі ў бібліятэках розных тыпаў у сучасных умовах характарызуецца *разнастайнасцю выкарыстоўваемых форм і метадаў* як класічнага кшталту (сустрэчы з паэтамі, кніжныя выставы, урокі і гадзіны паэзіі, літаратурна-музычныя гасцёўні і інш.), так і інавацыйнага характару (паэтычныя вечарыны «Вершы паэта: чытаем разам», паэтычныя флэш-мобы, паэтычныя гастролі, паэтычныя кавярні, па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этычныя брэйн-рынгі, віртуальныя мемарыяльныя музеі паэтаў, паэтычныя клубы ў сацыяльных сетках інтэрнэт і іншыя віртуальныя паэтычныя праекты, мэтавыя праграмы).

Сучасныя экспазіцыйныя формы папулярызацыі паэтычных твораў у бібліятэках прадстаўлены цыкламі персанальных выстаў, прысвечаныя паэтам-юбілярам; тэматычнымі выставамі, на якіх дэманструюцца не толькі выданні паэтычных твораў з фондаў бібліятэк, але і архіўныя дакументы, электронныя выданні, выставамі-віктарынамі, выставамі-вандроўкамі.

Прэзентацыі кніжна-ілюстрацыйных выставак суправаджаюцца выкананнем песень і рамансаў, напісаных сучаснымі кампазітарамі на вершы паэтаў-класікаў, мультымедыйнымі прэзентацыямі. Слайд-вечарыны, ілюстрацыйна-паэтычныя выставы (з дэманстрацыяй фотаздымкаў і твораў жывапісу, прысвечаных паэтам-класікам і героям іх паэтычных твораў) – прыклады сінтэтычнага падыходу да папулярызацыі паэзіі як аднаго з відаў мастацтва.

Паэтычны жанр займае значнае месца і ў сцэнарных планах папулярных зараз «Бібліятэчных начэй» і «Бібліятэчных змярканняў».

Бібліятэкі прымаюць удзел у такіх праектах, як «Паэзія ў парках», «Читающий бульвар» з мэтай папулярызацыі паэзіі ў месцах масавага адпачынку жыхароў горада, у т. л. праз «стрыт»-радыё. Падобныя праекты накіраваны на наданне паэзіі публічнага вымярэння. У межах акцый «міні-бібліятэкі ў грамадскім транспарце» («Паэтычны тралейбус», «Паэтычны аўтобус») і жыхары гарадоў Беларусі (Магілёва, Брэста, Гродна і іншых), мелі магчымасць прачытаць ці праслухаць тэксты вершаў сучасных паэтаў і класікаў нацыянальнай і сусветнай паэзіі, паэтаў-землякоў.

Адным з асноўных сродкаў папулярызацыі паэтычных твораў у бібліятэках застаюцца спецыялізаваныя *бібліяграфічныя рэсурсы*: базы даных, персанальныя бібліяграфічныя паказальнікі, біябібліяграфічныя слоўнікі, літаратурныя і краязнаўчыя календары, методыка-бібліяграфічныя матэрыялы. На старонках прафесійнага друку разглядаюцца асаблівасці анатавання паэтычных твораў у кантэксце стварэння рэестраў кніжных помнікаў.

Рэдкай, але эфектыўнай, формай папулярызацыі паэтычных твораў у бібліятэцы з'яўляецца *бібліятэчны (паэтычны) тэ-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*атр.* Прэм’ерай менавіта паэтычнага спектакля «Образ, бережно хранимый» да 200-годдзя з дня нараджэння А. С. Пушкіна 15 год таму распачаў сваю дзейнасць народны аматарскі тэатр «Грачи» пры Гомельскай абласной бібліятэцы. За час са свайго існавання супрацоўнікамі бібліятэкі (а менавіта яны – акцёры ў гэтым тэатры) пастаўлены спектаклі-партрэты, прысвечаныя Я. Купалу, Я. Коласу, Р. Гамзатаву, Т. Шаўчэнку [2].

У папулярызацыі паэтычных твораў, арганізацыі паэтычнай творчасці карыстальнікаў бібліятэк важную ролю адыграваюць клубныя, студыйныя формы работы.

Асаблівай увагі заслугоўваюць літаратурныя конкурсы, у т. л. конкурсы паэтычнай творчасці бібліятэкараў. Адзін з такіх конкурсаў, арганізатарам якога выступіла Гомельская абласная бібліятэка, быў прысвечаны раскрыццю вобразаў сучасных бібліятэкі і бібліятэкара, кнігі і чытання, іх ролі ў духоўным жыцці грамадства; папулярызацыі бібліятэчнай прафесіі.

Паэтычная творчасць чытачоў і бібліятэкараў часта рэалізуецца ў форме публікацый, у т. л. паэтычных зборнікаў.

У зборніках і іншых публікацыях адлюстравана і паэтычная творчасць студэнтаў і выкладчыкаў устаноў вышэйшай бібліятэчнай адукацыі [3].

Паэзія з’яўляецца адным са старажытных спосабаў самавыражэння, самаасэнсавання. Пры гэтым, кожны мае ўласную крыніцу натхнення. Нас цікавяць найперш тыя літаратурнамастацкія тэксты, якія адлюстроўваюць адносіны чалавека, у нашым выпадку менавіта студэнтаў ФІДК, да ўласнай / будучай прафесіі. Цікавым уяўляецца той факт, што паэзія, з’яўляючыся адным з відаў літаратурнай творчасці, валодае асацыятыўнай умоўнасцю у найбольшай ступені, чым проза і драматургія, ёй уласціва індывідуальная словатворчасць і вобразная дакладнасць адначасова. Чым больш арыгінальнае светабачанне асобы, тым больш цікавыя вобразы. Любы мастацкі твор, а тым больш паэтычны, не павінен стаць люстраным адбіткам жыццёвых рэалій, аднак абавязкова павінен быць эстэтычна накіраваным, заключаць у сабе пэўную ідэю, мець у сабе калі не высокамастацкія, то кранальныя вобразы.

Праведзенае намі лінгвістычнае даследаванне мовы і вобразаў твораў студэнтаў названай спецыяльнасці дазваляе зрабіць некалькі істотных вывадаў: па-першае, паэтычная творчасць можа стаць і, магчыма, у пэўнай ступені ўжо з’яўляецца сродкам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фарміравання прафесійна-асобасных кампетэнцый студэнтаў, па-другое, тэматыка твораў выхаванцаў ФІДК разнастайная, па-трэцяе, многія са студэнтаў прысвячаюць свае вершы менавіта прафесіі, усведамляючы ўсе перэпетыі сваёй будучай працы.

Ключавымі словамі такіх твораў найперш з'яўляюцца КНІГА, БІБЛІЯТЭКА, БІБЛІЯТЭКАР / БІБЛІЁГРАФ. Ключавымі лексемамі ў дадзеным выпадку мы называем тыя словы, якія непасрэдна суадносяцца з тэмай тэксту, а таксама прама ці ўскосна звязаныя з прафесійнай дзейнасцю. Найперш – гэта лексемы чытаць, каталог, паліца / старонкі (кніг), а таксама прозвішчы / імёны, хутчэй за ўсё, любімых аўтараў / персанажаў ці тых літаратурных герояў, імёны якіх неабходныя для раскрыцця ідэйнага зместу твораў (*Ты будзеш вучнем, а настаўнік – / Шэкспір, Вальтэр, Купала, Кафка* (Д. Гузавец); *Вот книга Гоголя, Бальзака, / Вот Тютчев рядышком стоит. / Тургенев пишет про собаку / И Пушкин сказки говорит* (А. Генбура).

Паэтызуючы прафесійную дзейнасць, тым самым раскрываючы сваё стаўленне да яе, маладыя творцы ствараюць тыя арыгінальныя мастацкія сродкі, праз якія не толькі вобразна, але і дакладна акрэсліваюць паняцце: *Бясконцы свет цікавай кнігі, / Свет кнігі для людзей – маяк; Патрапіўшы ў палон да кнігі, / Ты ўжо не вырвешся ніяк* (Д. Гузавец); *Тепло, любовь нам книга дарит; А как же о душе забота? / А как же кнниги волшебство?!* (А. Фёдарава); *Цяпер я разумею, / Што кніга – цэлы свет* (Ю. Літвіновіч). Можна сказаць, што вобраз кнігі, створаны студэнтамі ФІДК, дазваляе гаварыць пра персаніфікацыю дадзенага паняцця: *книга манит за сабой*, *адкрывае цікавы свет*, *яна і настаўнік, і сябра, і дарадчык: У сонечным пакоі / Паліца кніг стаіць; Матуля ёй сказала, / Што ў кнігах ёсць жыццё* (Ю. Літвіновіч); *Сябры мае, з высокіх шафаў / Прыходзіце вы часта да мяне* (В. Скачок*); Тут кніга свет нам адкрывае / душу і свет нам саграваe* (Г. Наумовіч-Карачун).

У кнізе няма месца мане, у ёй сканцэнтравана ўся праўда жыцця, свет кнігі поўны хараства: *Старонкі розных кніг гартаю / Жыцця аснову спасцігаю* (Г. Наумовіч); *В нем жизнь кипит, бурлит рекою. / Там приключения, азарт. / В нем нету места лжи и горю, / Там каждый друг тебе и брат. / Ты с книгой можешь быть собою, / И устремляешься туда, / Где звезды,*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*небо и луна, / Где шепот листьев над водою, / И в речке легкая вода* (А. Фёдорова).

Той чалавек, які абраў шлях служэння кнізе, безумоўна, не можа не захапляцца і самім працэсам чытання: *Снежинки в танце медленном кружаться. / Зима на белом свете… холода… / Я книгу в руки взял – / и все забыто. / И сильные морозы – не беда; Мои хорошие, пожалуйста, потише, / Прошу вас, тише… / Дайте книгу почитать; Должны спасибо говорить ей [книге] вновь и вновь* (А. Шаўрук).

У прааналізаваных намі тэкстах выкарыстаны перыфразы, якія таксама недвухсэнсоўна акрэсліваюць як само паняцце кнігі, так і выяўляюць адносіны да яго: *Любы́ дакумент на вякі захаваюць. / Усе* ***кніжныя скарбы*** *ў алмазе збяруць; У* ***кніжным моры*** *– навігатар* (Д. Гузавец). У такім выпадку не меншае пачуццё захаплення выклікае і сама бібліятэка-будынак, якая атаясамляецца творчым студэнцтвам, напрыклад, з *храмам навукі*, а само слова *алмаз* асацыюецца не толькі з формай Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, але і падкрэслівае раўнавартаснасць каштоўнага каменя і кнігі. У кантэксце часу, калі збядняецца духоўнасць асобы, дадзенае супастаўленне якраз і дэманструе тое, што сучасны выпускнік ФІДК – асоба ўсебакова развітая: у век камп'ютарных тэхналогій бібліятэка застаецца для яго цэнтрам культуры, храмам мудрасці і г. д., выклікае самыя нечаканыя станоўчыя асацыяцыі-супастаўленні: *Хто ў парк ідзе, на дыскатэку, / Я крочу ў бібліятэку; Бібліятэка як скарбонка – / Жыцця чароўная старонка; Каб ваша сэрца не старэла, / Душа каб вечна маладзела, / Хадзем са мной у цэнтр культуры, храм мудрасці, літаратуры!* (Г. Наумовіч-Карачун)*; Библиотека – наша гордость. / Сюда ты не забудь зайти!* (А. Генбура); *Узвышаецца неардынарны будынак, / Як ружа сярод звычайных раслін* (Д. Гузавец). Большасць студэнтаў адухаўляюць і бібліятэку, надзяляюць яе рысамі, уласцівасцямі, магчымасцямі чалавека, ствараючы тым самы фігуру ўвасабленне: *Усім навукоўцам дапамагае, /* ***А бібліятэкам яна метадыст*** (Д. Гузавец); *Ты – / Не просто книг четыре этажа, / Не просто кладзезь опыта и знаний. / Ты / Многое в одном: В тебе живет душа, / Науки, нужной людям, / И исканий; Ты –* ***лечишь души****, науки храм, / Душе дающий мудрости бальзам* (К. Багдановіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самаасэнсаванне ўласнага прызначэння, сваёй ролі ў жыцці грамадства, самаідэнтэфікацыя асобы адбываецца праз усведамленне сябе як прадстаўніка адпаведнай прафесіі. Большая частка творчага студэнцтва ставіцца да працы бібліятэкара / бібліёграфа з павагай, з захапленнем: *Описывает книги библиограф. / Пускай он не портной и не фотограф, / Профессия почетна и важна, / Читающему обществу нужна!* (М. Бурносенко). Аднак ёсць немалая колькасць тэкстаў, у якіх выяўляецца пачуццё іроніі і лёгкага гумару, што не пазбаўляе іх станоўчага аўтарскага стаўлення да абранай прафесіі: *Быццам Ёжка на мятле, / Ты ў кніжнай старане; Ты на працы лынд не бі! / Ты ўсё хуценька рабі! / Падыміся, усміхніся, / У «біблі-фею» абярніся!* (К. Машко); *Библиограф, признайся, скажи мне, / Городской ты, упитанный кот: / Хлебом чьим до сих пор еще живы / Те, кто русскую душу несёт* (П. Макееў). Студэнт, сам выступаючы суб'ектам прафесійнай дзейнасці, верыць у паважлівае стаўленне да яе: *Библиограф, дай автограф! Поклонюсь до самых ног* (Д. Кныр). Інакш і быць не можа: бібліятэка як сацыяльны інстытут была і застаецца асяродкам культуры, сферай самаўдасканалення асобы. Магчыма, пагэтаму паэтызуюцца і бібліяграфія, і каталог, на першы погляд, зусім не паэтычныя рэчы: *Не шутите с каталогом, / Он – система всех систем. / Коль нарушим мы систему – / Нашим всем трудам конец. / Не шутите с каталогом, / Это сердце всех сердец!* (А. Самбук); *Библиография – начало всех начал. / Её познать бы рад и стар, и мал. / Почувствуй жажду знаний, и тогда / Она откроет времени врата* (Д. Кныр).

Паэтычная творчасць студэнтаў не рэгламентуецца вучэбна-метадычнай дакументацыяй, здзяйсняецца яна не па вучэбных планах, а па натхненні, якое атрымлівае своеасаблівы эмацыйны штуршок, у кантэксце падрыхтоўкі да святкавання такіх дат, як Дзень бібліятэк Беларусі (15 верасня), Міжнародны дзень роднай мовы (21 лютага), правядзення паэтычных вечарын («Над намі словы ўладараць», «Пад парасонам слова», «На адлегласці працягнутай рукі» і інш.), праходжання (асабліва першай) вытворчай практыкі.

Пэўную магчымасць для творчага ўсведамлення рэалій прафесіі ў паэтычным жанры даюць і інавацыйныя формы вучэбных заняткаў па спецыяльных дысцыплінах, напрыклад, падрыхтоўка культурна-масавых мерапрыемстваў, удзел у вучэб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных навукова-практычных канферэнцыях з элементамі «культурнай праграмы», наведванне студэнтамі бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў Беларусі з мэтай падрыхтоўкі індывідуальных заданняў у рамках кіруемай самастойнай працы, прысутнасць на паэтычных мерапрыемствах у розных тыпах бібліятэк, сустрэчы з майстрамі паэтычнага жанра ў бібліятэцы ўніверсітэта, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і інш.

Шэраг вершаў прафесійнай тэматычнай накіраванасці быў напісаны студэнтамі ў рамках майстар-класаў для студэнтаў ФІДК такіх вядомых спецыялістаў у сферы сацыяльных камунікацый і бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, як А. В. Сакалоў і В. П. Лявонаў, у т. л. і спецыяльна праведзенага А. В. Саколовым творчага конкурсу, мэтай якога было адлюстраванне сутнасці паняцця «інфармацыя».

Паэтызацыя прафесійнай дзейнасці – гэта, у пэўнай ступені, і вынік пастаяннага функцыянавання на факультэце літаратурнага аб'яднання «БУКет», вынікі працы якога апублікаваны ў шэрагу калектыўных зборнікаў.

---

*1.* Библиотерапия: самоактуализация психических состояний через поэзию : учебное пособие / Н. Т. Оганесян. – М. : ОсЬ-89, 2002. – 272 с.

*2. Ю. Максименко, С. Шимко.* «Грачи» прилетели // Бібліятэчны свет. – 2014. – № 4. – С. 12–14.

*3.* Всем нам дорог и мил библиотечно-информационный мир : сб. стихотворений: пособие для студентов и аспирантов библ.-информ. отд-ний учеб. заведений России по курсу «Введ. в специальность» / В. И. Терешин ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств, Библ.-информ. ин-т. – М., 2004. – 47 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ